*Ю. Д. Пярсідская,*
*старшы выкладчык кафедры тэатральнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства*

# ТРАДЫЦЫІ ЎКЛАДУ МАСТАЦКАГА ЖЫЦЦЯ МАГІЛЁВА Ў XVII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVII ст. фарміравалася ў залежнасці ад важкага дзяржаўнага фактару: у гэты час існавалі два тыпы гарадоў – прыватнаўласніцкія, падпарадкаваныя магнату, і каралеўскія, што знаходзіліся пад уладай караля і кіраванне якімі ажыццяўлялася абранымі каралём асобамі – ваяводай і членамі магістрата. Характар мастацкага жыцця прыватнаўласніцкага горада цалкам вызначаўся якасцямі асобы магната і яго веравызнаннем, светапоглядам, асабістымі жыццёвымі пазіцыямі. У сваю чаргу, характар мастацкага жыцця ў гарадах каралеўскага падпарадкавання залежаў ад геапалітычнага становішча горада, прыналежнасці яго да заходняй ці ўсходняй часткі краіны, ад дамінавання ў горадзе пэўнай канфесіі ці суіснавання розных канфесій, а таксама ад прыярытэтнага прафесійнага кірунку цэхавых карпарацый ці аб’яднанняў, якія існавалі ў ім.

Незалежнасць ад улады ваяводаў, паноў, старастаў даравалася гарадам Магдэбургскім правам, якое Магілёў атрымаў з прычыны каралеўскай граматы Стэфана Баторыя (28 студзеня 1577 г.).

Тагачаснае мастацкае жыццё Магілёва вылучалася разнастайнасцю і неаднароднасцю форм свайго праяўлення: пераважалі агульнагарадскія мерапрыемствы – рэлігійныя ўрачыстасці. Арганізацыя іх праходзіла па старажытных канонах, што здаўна існавалі на тэрыторыі Беларусі, таму ў рэлігійных цырымоніях перавага аддавалася музычнаму афармленню. Гэта былі шэсці з іконамі пад звон званоў (ці хросныя хады) са спяваннем духоўных гімнаў і песнапенняў. У архіўных звестках адзначалася: «Як пачалі спяваць Херувімскую песнь... ад паўдзённых дзвярэй знатных мяшчан 24 чалавекі выйшлі з вялікімі свечкамі васкавымі зялёнымі і сталі насупраць алтара...» [6, с. 49]. Характэрная рыса агульнагарадскіх мерапрыемстваў менавіта ў Магілёве – гэта тое, што ў музычным афармленні нават

каталіцкіх свят у гэтым горадзе нярэдка бралі ўдзел праваслаўныя спевакі. Так, у магілёўскай магістрацкай кнізе сведчыцца, што «спеваком брацкимъ, которые спевали ведле ратушу на Боже Цело дали золотый и гарнецъ меду» [4, с. 74]. Дарэчы, хор праваслаўных брацкіх спевакоў выконваў песнапенні і падчас свецкіх гарадскіх мерапрыемстваў. Дадзены факт сведчыць аб тым, што гарадскія ўлады і духавенства г. Магілёва надавалі вялікае значэнне музычнаму афармленню цырымоній.

Мастацкае жыццё горада трымалася на ўстойлівасці даўніх традыцый – тут не прымаліся ўсходнееўрапейскія рэлігійныя (праваслаўныя) новаўвядзенні, ігнаравалася ўсялякага роду тэатралізацыя як праяўленне «бясоўскай гульні». У летапісах г. Магілёва за 1594 г. згадваецца аб нязвычным для гараджан абрадзе, што адпраўляла праваслаўнае брацтва: «...потым настала якоесь брацтва святога Спаса: па месцы хадзілі, новыя цырымоніі чынілі не ведлуг уставу святых айцоў, на асляці па колькі рок ездзілі» [1, с. 196]. Відавочна, «хаджэнне на асляці» дагэтуль не сустракалася ў практыцы праваслаўнай царквы, і можна меркаваць, што падобная тэатралізацыя абрадаў праіснавала ў горадзе параўнальна нядоўга («хаджэнне на асляці», «амавенне ног»). Стольнік Пётр Талстой у сваім падарожным дзённіку зазначаў, што, калі ён знаходзіўся ў Магілёве падчас Перадвелікоднага тыдня і прысутнічаў на богаслужэнні ў царкве Уваскрэсення Хрыстова, там не праводзіўся абрад амавення ног «...па звычаю грэцкага закона», акрамя таго, падкрэсліваў стольнік, «і ў саборнай царкве ... таго дзейства не адбываецца...» [6, с. 3].

Безумоўна, непрыняцце ўсялякага роду тэатралізацыі было звязана з дамінаваннем у горадзе праваслаўнай канфесіі, а таксама з утварэннем у 1632 г. Магілёўскай праваслаўнай епархіі, якая пасля царкоўнай уніі засталася адзінай праваслаўнай епархіяй у Беларусі. Менавіта тут захоўваліся старадаўнія праваслаўныя традыцыі, і нават правядзенне каталіцкіх свят не мела такой рэпрэзентатыўнасці і пышнасці, як у гарадах, што знаходзіліся на захадзе беларускіх зямель.

Традыцыйнасць і маруднасць у перайманні заходнееўрапейскіх новаўвядзенняў – мадэль правядзення агульнагарадскіх цырымоній, што ўсталявалася ў Магілёве на пачатку XVII ст. і практычна не мянялася на працягу ўсяго стагоддзя. Найбольш тыповым прыкладам агульнагарадской свецкай цырымоніі з’яўляецца сустрэча ў Магілёве Серапіёна Палхоўскага, епіскапа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мсціслаўскага, Аршанскага і Магілёўскага, архімандрыта Слуцкага. У 1699 г., напярэдадні свята Раства Хрыстова, Серапіёна Палхоўскага «...сустракала духавенства хрыстовым ходам, сам магістрат увесь і асабліва гарадская гандлярская моладзь з харугвай гандлёвай хаты, конна і ўрачыста, з немалою, у некалькі соцень коней, світай. Як ніколі харугвы жаўнерскія найуборнейшыя, што лепш і быць не маглі, да гэтага яшчэ ўсе рамеснікі, убраныя, з харугвамі, са зброяй, і некалькі дзесяткаў разоў адсалютавана з гармат...» [7, с. 251].

Нягледзячы на ўстойлівасць традыцый, заходнееўрапейскі ўплыў паступова пранікае ў афармленне некаторых агульнагарадскіх свят. З сярэдзіны XVII ст. назіраецца перайманне традыцыі ўзвядзення аказіянальнай архітэктуры, аб чым сведчаць запісы магістратаў Магілёва. Так, да свята на вуліцах горада ўзводзіўся часовы алтар: «...к святу римскому Божого Цяла… купили жердей шесть для убераня олтара предъ ратушою…» [3, с. 123]. Цікава, што алтароў магло быць і некалькі (даследчыкі згадваюць да чатырох), і перад кожным адбывалася святочнае богаслужэнне. Алтар звычайна будавалі з дрэва мясцовыя дойліды, абівалі тканінай («...за позичене обітя, Каранскому золотых 6») [2, с. 150], упрыгожвалі вянкамі з духмяных траў – спецыяльна для свята кожны год закуплялі май (кветкі), містру, зіолкі, ліліі. З царквы прыносілі іконы, пад якімі запальвалі свечы, звычайна залацістага ці зялёнага колеру. Шлях урачыстай працэсіі быў усыпаны кветкамі, цэхавыя рамеснікі ішлі з вялікімі рознакаляровымі свечкамі. Гарадскія брамы (падобна трыумфальным аркам) распісваліся вобразамі святых, аб чым сведчыць запіс з магістрацкай кнігі Магілёва: падчас рэлігійнага свята гарадскую браму (Ільінскую) упрыгожваў мясцовы маляр Саўка, які «...за маляване двухъ образовъ на таблицахъ древняныхъ воображеніе Пресвятыя Богородицы, на другой таблицы воображенное святого сваднаго пророка ревнителя Божия Илли Фезвитянина...» атрымаў 8 залатых [3, с. 186].

На кожнай браме, а таксама каля цэркваў гарадскім магістратам звычайна ўсталёўваліся гарматы (старадаўняя традыцыя, якая была характэрна больш для свецкіх вітальных урачыстасцей). Прыкметна, што на працягу XVII ст. кульмінацыйныя моманты падчас урачыстасцей (у тым ліку і рэлігійных) усё часцей суправаджаюцца гарматнымі выбухамі. Рускі стольнік Пётр Талстой наступным чынам апісвае святкаванне Пасхі ў Магілёве ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1697 г.: «А як пачалі чытаць апостал, у той час з многіх гармат стралялі трыкратна... як пачалі спяваць Херувімскую песнь, у той час стрэльнулі з гармат адзінажды... як панеслі артус... быў вялікі звон, па тым звоне з адной вялікай гарматы стралялі» [6, с. 49–50]. У Магілёўскай магістрацкай кнізе сустракаюцца рэгулярныя запісы аб набыцці магістратам пораху на святы не толькі каталіцкія, але і праваслаўныя (гарматы ставіліся каля кожнага касцёла і царквы): «Купили пороху к Воскресеню Христову, рускому и рымскому… (каталіцкаму. − *Ю.П.*)» [4, с. 59]. Дадзены факт сведчыць аб непазбежным уплыве заходнееўрапейскай моды, згодна з якой кульмінацыйныя моманты ўрачыстасцей суправаджаліся вогненнымі ці папяровымі феерверкамі.

У 1686 г. жыхары горада асабліва ўрачыста віталі канцлера Вялікага Княства Літоўскага пана Агінскага з нагоды паспяховага вяртання яго з Масквы. Князя сустракалі ўсе гараджане, а цэхі нават выехалі (па старажытным звычаі) за межы Магілёва насустрач Агінскаму, каб праводзіць яго да горада. Дзеля важнай падзеі паставілі «…до Брамы Шкловской гармату одну великую и три подделки; ещё гармату великую на Ветреной, возле ратушных ворот, и подделков три, ещё на браме Ветреной з великой гарматы на триумф стреляли, даючи знать же Пан Бог дал з Москвою упокой; а вельможного его милость канцлера, посла великого Княства Литовского со всими цехами в полю спотыкали и честно до места Могилева впроводили, теды со всих гармат стреляли и Пана Бога хвалили за такую потешную оказыю» [цыт. па: 5, с. 117].

У цэлым мастацкае жыццё Магілёва грунтавалася на панаванні мясцовых традыцый, а заходнееўрапейскія новаўвядзенні пераймаліся марудна і толькі праз пэўны час ужываліся ў адаптаваным выглядзе. Тут пераважалі рэлігійныя па характару цырымоніі – шэсці духавенства, гарадскіх цэхавых карпарацый рамеснікаў з асабістымі эмблемамі, зброяй і інструментамі, багата аздобленыя музыкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Беларускія* летапісы і хронікі: пер. са старажытнарус., старабеларус. і польск. / уклад. У. Арлоў. − Мінск: Беларус. кнігазбор, 1997. − 432 с. : іл.

2. *Историко-юридические* материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Созонова. – Витебск: Тип. Губерн.

правления, 1871. – Вып. 1. – 377 с.

3. *Историко-юридические* материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Созонова. – Витебск: Тип. Губерн. правления, 1873. – Вып. 4. – 432 с.

4. *Историко-юридические* материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Созонова. – Витебск: Тип. Губерн. правления, 1879. – Вып. 10. – 544 с.

5. *Марзалюк, І.* Магілёў у XII–XVIII стст.: (Людзі і рэчы) / І. Марзалюк. – Магілёў; Мінск: Веды, 1998. – 206 с. : іл.

6. *Первоисточники* для истории Могилевского края. – Одесса: Тип. Епархиального дома, 1916. – Вып. 1: Варколабовская летопись. Путевые заметки стольника Толстого /под ред. Е. Р. Романова. – 56 с.

7. *Полное* собрание русских летописей. – М.: Наука, 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост. и ред. Н. Н. Улащик. – 305 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ